ДУК “Дзятлаўская раённая бібліятэка”

Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці, метадычнай работы і фарміравання бібліятэчнага фонду

С З Л

# СВАЁ — значыць лепшае

## літаратурна-творчы праект




Дзятлава, 2026

**Дэвіз:** “*Чытайце роднае! Чытайце з асалодай! Чытайце разам з намі!*”

## Актуальнасць

У сучасных умовах інфармацыйнай перанасычанасці, калі кніжны рынак усё часцей арыентуецца на камерцыйныя інтарэсы, асабліва востра паўстае пытанне пра захаванне і папулярызацыю сацыяльна значнай літаратуры.

- **Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.** Сацыяльна значныя выданні спрыяюць асэнсаванню гісторыі, культуры і традыцый народа, выхоўваюць павагу да роднай мовы і нацыянальных каштоўнасцяў.
- **Маральна-духоўнае выхаванне.** Такія кнігі вучаць адказнасці, спагады, патрыятызму, фарміруюць у моладзі высокія маральныя арыенціры.
- **Роўны доступ да ведаў.** Бібліятэкі, як грамадскія інстытуты, забяспечваюць магчымасць кожнаму чытачу — незалежна ад узросту, сацыяльнага статусу ці месца жыхарства — знаёміцца з якаснымі і патрэбнымі выданнямі.
- **Захаванне культурнай спадчыны.** Праект садзейнічае папулярызацыі твораў беларускіх аўтараў, якія адлюстроўваюць духоўны свет нацыі і захоўваюць традыцыі для будучых пакаленняў.
- **Развіццё чытацкай культуры.** Праз сістэмную працу бібліятэк фарміруецца цікавасць да чытання, уменне выбіраць сапраўды каштоўныя кнігі, што супрацьстаіць павярхоўнаму спажыванню інфармацыі.
- **Умацаванне ролі бібліятэкі.** Праект падкрэслівае значнасць бібліятэкі як цэнтра духоўнага і культурнага жыцця рэгіёна, які не толькі захоўвае кнігі, але і актыўна ўплывае на фарміраванне грамадскай свядомасці.

Такім чынам, праект **“Сваё — значыць лепшае”** з’яўляецца актуальным і неабходным, бо ён не толькі папулярызуе сацыяльна значную літаратуру, але і спрыяе развіццю асобы, захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці і ўмацаванню культурнай супольнасці.

**<u>Мэта праекта:</u>**забяспечыць шырокі і роўны доступ насельніцтва да сацыяльна значнай літаратуры, садзейнічаць яе папулярызацыі і выкарыстанню як асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, маральных каштоўнасцяў і патрыятызму, а таксама ўмацаваць ролю бібліятэкі як культурна-асветніцкага і духоўнага цэнтра рэгіёна.

## Задачы праекта:

- **Папулярызацыя сацыяльна значнай літаратуры** праз арганізацыю тэматычных выставак, экспазіцый, фотазон,

чытацкага салона “Буцік лепшых беларускіх кніг”, анлайн рубрыкі “Гаворыць кніга”. Выкарыстанне хэштэга #Дзеньроднагасвайго.

- **Захаванне і перадача культурнай спадчыны** шляхам актыўнага ўключэння ў фонды бібліятэк твораў беларускіх пісьменнікаў і выданняў, што адлюстроўваюць гісторыю і традыцыі народа.
- **Фарміраванне чытацкай культуры** праз правядзенне бібліякроса “Сваё – значыць лепшае” з выязнымі інфарматыўнымі выставамі-аглядамі ў разнастайныя арганізацыі і прадпрыемствы рэгіёна.
- **Умацаванне ролі бібліятэкі** як культурна-асветніцкага цэнтра рэгіёна, які забяспечвае роўны доступ да ведаў для ўсіх груп насельніцтва.
- **Супрацоўніцтва з адукацыйнымі і культурнымі ўстановамі** для пашырэння кола чытачоў і сумеснай працы над папулярызацыяй сацыяльна значных выданняў.
- **Падтрымліваць сувязь** з выдавецтвамі і мясцовымі аўтарамі.
- **Падкрэсліць каштоўнасць** сацыяльна значных кніг праз спецыяльныя сімвалы (чырвоная стужка).
- **Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій** (электронныя каталогі, сацыяльныя сеткі, сайт установы) для прыцягнення ўвагі да каштоўных кніг і пашырэння аўдыторыі.

**Змест праекта:**

1. Арганізацыя бібліякроса “Сваё – значыць лепшае” з выязнымі інфарматыўнымі выставамі-аглядамі ў разнастайныя арганізацыі і прадпрыемствы рэгіёна.

✓ *Асноўныя блокі: гісторыя Беларусі, сучасная літаратура, дзіцячыя кнігі, сацыяльна значныя выданні.*

✓ *Дадатковыя элементы: фотазоны, закладкі з цытатамі, інтэрактыўныя віктарыны.*

*Што квартальна. Бібліятэкі ДУК “Дзятлаўская раённая бібліятэка*”

2. Анлайн-рубрыка “Гаворыць кніга”

✓ *Серыйныя выпускі ў сацыяльных сетках і на сайце бібліятэкі:*

- *«Гаворыць проза»* — урыўкі з раманаў і апавяданняў (I квартал)
- *«Кніга пра Беларусь»* — краязнаўчая і гістарычная літаратура (II квартал)
- *«Кнігі для дзяцей»* — казкі і апавяданні для малых (III квартал)

- *«Паэзія, якая гучыць»* — чытанне вершаў беларускіх аўтараў (IV квартал)

Фармат:
- кароткія відэа (2-5 хвілін);
- у кожным выпуску — чытанне ўрыўка з кнігі (паэзія, проза, эсэ);
- каментарый бібліятэкара або чытача: чаму менавіта гэты ўрывак важны, цікавы, актуальны;
- візуальнае афармленне: кніга ў кадры, фон з элементамі беларукай культуры (арнамент, прадметы побыту, выстава).

*На працягу года. Бібліятэкі ДУК "Дзятлаўская раённая бібліятэка*".

3.Удзел у рэспубліканскім праекце "Кожная пятніца – роднае, сваё":
- арганізацыя на сайце ўстановы рубрыкі "Чытаем з асалодай"**:** штотыднёвая рэклама адной беларускай кнігі з кароткім апісаннем і цытатай.

*На працягу года. Дзятлаўская раённая бібліятэка.*
*Філіял "Казлоўшчынская ГПБц"*
*Філіял "Наваельнянская ГПБц"*

**Чаканыя вынікі:**

- **Павышэнне** цікавасці да сацыяльна значнай літаратуры сярод розных узроставых груп карыстальнікаў.
- **Захаванне** і папулярызацыя нацыянальнай культурнай спадчыны праз актыўнае выкарыстанне твораў беларускіх аўтараў.
- **Фарміраванне** чытацкай культуры і маральных каштоўнасцяў у дзяцей і моладзі, выхаванне патрыятызму і павагі да гісторыі.
- **Умацаванне** ролі бібліятэкі як культурна-асветніцкага і духоўнага цэнтра рэгіёна.
- **Развіццё** партнёрскіх сувязяў паміж бібліятэкамі, школамі, культурнымі і грамадскімі арганізацыямі.
- **Выкарыстанне** сучасных інфармацыйных тэхналогій для пашырэння аўдыторыі і прыцягнення моладзі да чытання.
- **Рост** колькасці наведвальнікаў бібліятэк, сайта і ўдзельнікаў мерапрыемстваў, прысвечаных сацыяльна значнай літаратуры.

**Арганізатар праекта:**аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці, метадычнай работы і фарміравання бібліятэчнага фонду

**Выканаўцы:**бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры “Дзятлаўская раённая бібліятэка”

**Тэрмін рэалізацыі:** доўга тэрміновы